ШКОЛЬНАЯ ПРАГРАМА

**Л. Э. Сенкевіч, М. К. Грыцэнка, Н. А. Дабравольская**

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## 3 клас

***Тэставыя работы з правіламі і заданнямі***

Дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання

Мінск

«Сэр-Віт»
2023

# Ад аўтараў

***Шаноўны трэцякласнік!***

Рады прапанаваць табе дапаможнік для лепшага засваення пройдзеных тэм. Карыстаючыся ім, ты зможаш на пачатку кожнай тэмы паўтарыць патрэбнае правіла, папрацаваць над тэмай, а таксама праверыць узровень сваіх ведаў. Заданні вельмі цікавыя: скласці прыказкі, уставіць прапушчаныя літары, знайсці лішнія словы і г. д.

У дапаможніку шмат вершаў знакамітых беларускіх паэтаў, пісьменнікаў. Чытай правілы, выконвай практыкаванні, вучыся гаварыць па-беларуску. Прапануюцца практыкаванні для адпрацоўкі арфаграфічных навыкаў, шмат матэрыялу для развіцця маўлення і пашырэння лексічнага запасу.

***Поспехаў табе, дружа, у вывучэнні роднай мовы.***

Дапаможнік можа быць карысным і настаўнікам, таму што змяшчае ўсе правілы трэцяга класа, а таксама тэставыя работы. Прапанаваныя матэрыялы дазволяць паглыбіць веды вучняў, дадуць магчымасць не толькі адпрацаваць арфаграфічныя навыкі, але і разнастаіць практычныя заданні, найбольш эфектыўна арганізаваць індывідуальную і дыферэнцыраваную работу з улікам здольнасцей дзяцей. Многія заданні суправаджаюцца сістэмай пытанняў, якія будуць спрыяць арганізацыі паўтарэння на працягу ўсяго курса вывучэння мовы.

Дапаможнік можа выкарыстоўвацца як на ўроках, так і на факультатыўных і стымулюючых занятках.

**Бацькі** могуць выкарыстоўваць дапаможнік як для ліквідацыі прабелаў у ведах сваіх дзяцей, так і як даведнік, дзе ёсць усе правілы, якія спатрэбяцца пры вывучэнні мовы на працягу ўсяго навучальнага года.

***Памятка!*** Апостраф пішацца пасля літар, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі, перад літарамі ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і***, калі паміж зычным і галосным вымаўляецца

[й’э] [й’у] [й’а] [й’і]

гук [й’]: *надвор’е, п’ю, аб’ява, вераб’і.*

Апостраф не пішацца пасля літары ***ў*** (у нескладовае):

[й’і] [й’э]

*салаўі, здароўе.*

***Памятка!*** Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля літар ***л***, ***н***, ***з***, ***с***, ***ц***, якія абазначаюць мяккія гукі, і спалучэння літар ***дз*** перад ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і***: ***лье****цца, Арсе****нье****ў, Афана****сье****ў, пар****цье́****ры, Арка****дзье****ў.*

**5.** Прачытай сказ. Назаві першы зычны гук у кожным слове.

У цёплы летні дзень Ніна збірала сена.

[ц’] [л’] [дз’] [н’] [з’] [с’]

✶ ***Запомні сказ.*** Гэта дапаможа табе ўспомніць, пасля якіх мяккіх зычных пішацца раздзяляльны мяккі знак.

**6.** Устаў ***ь*** ці ***апостраф***.

Іл..я, паштал..ён, пад..ём, узмор..е, шампін..ён, аб..ём, сузор..е, Мар..ян, п..яўкі, грыл..яж, Аркадз..

жаўтадзюбыя птушаняты. Пачулі мяне і выцягнулі з гнязда галоўкі. Падумалі, што маці прыляцела з кормам. Каб не спудзіць птушанят, я спусціўся па лесвіцы на зямлю. Пафарбую дах і ўвосень. (*Часопіс «Вясёлка»*.)

✶ Складзі план тэксту.

__________________________________________

__________________________________________

__________________________________________

**3.** Прачытай тэкст. На колькі частак яго можна падзяліць? Пазнач часткі літарамі **П**, **А**, **З**.

### Пра зязюлю

Жылі-былі брат і сястра. Брат быў вельмі бедны, а сястра – дужа багатая. Аднойчы пайшоў брат да сястры, каб хоць кавалкам хлеба дапамагла.

Сястра скупая была, сказала, што ключы ад клеці згубіла. І пачала яна нібы шукаць ключы. Брат стаяў, стаяў пад акном, чакаў, чакаў і нарэшце не вытрымаў і пайшоў. На дарозе паваліўся і памёр ад голаду.

Сястра зразумела, што зрабіла дрэнна, і стала клікаць брата:

– Якуб, Якуб, вярніся. Ключы знайшліся!

## Антонімы

***Памятка!*** Словы з процілеглым значэннем называюцца **антонімамі**: *чысціня – бруд, мяккі – цвёрды, маўчаць – гаварыць.*

### *Папрактыкуйся.*

**1.** Прачытай сказы. Адшукай антонімы, падкрэслі іх.

Яснае сонца праглянула скрозь цёмныя хмары. Ад такога жыцця не ведаю, ці плакаць, ці смяяцца. Пад сонцам шчодрым і скупым жыве і радасць, і трывога.

(*Паводле Р. Баравіковай.*)

**2.** Злучы словы з супрацьлеглым значэннем.

| | |
|---|---|
| Вясёлы | захад |
| звонка | мір |
| усход | глуха |
| вайна | сумны |

**3.** Прачытай усе словы. Знайдзі антонімы. Запішы іх парамі.

Лета, вечар, цямнець, маўчаць, святлець, брудны, мелкі, чысты, глыбокі, ноч, зіма, дзень, шумны, раніца, кароткі, ціхі, доўгі, гаварыць.

**4.** Замяні ў сказах словы ў дужках антонімамі.

(Цёплая) ____________________ ноч паволі апускалася на зямлю. (Хутка) ___________________ плылі шэрыя хмары. (Хадзіла) __________________ незвычайная цішыня. Зямля рыхтавалася да сну.

***Словы-падказкі***: павольна, халодная, стаяла.

**5.** Прачытай. Да ўстойлівых спалучэнняў левага слупка падбяры супрацьлеглыя па сэнсе з правага слупка. Злучы іх лініямі.

| | |
|---|---|
| Ад рук адбіўся. | Вады ў рот набраць. |
| Ля́сы тачыць. | Трымаць у яжовых рукавіцах. |
| Трымаць вуха востра. | Не пакладаючы рук. |
| Сядзець, склаўшы рукі. | Варон лічыць. |

## Словы, аднолькавыя па гучанні, розныя па значэнні

***Завяжы вузялок!*** У беларускай і рускай мовах ёсць словы, падобныя або аднолькавыя па гучанні, але розныя па значэнні.

### *Папрактыкуйся.*

**1.** Прачытай, выпішы выдзеленыя словы, перакладзі іх на рускую мову.

Мы нядаўна пераехалі ў новую кватэру. Кватэра прасторная, у ёй тры пакоі. У прыхожай стаіць **шафа.** У шафе ляжаць і вісяць нашы **рэчы.** На сцяне вісіць **люстэрка.** У мяне ёсць свой **пакой.** У ім стаяць **канапа,** шафа для кніг, пісьмовы стол. На падлозе ляжыць мяккі **дыван.**

| *У беларускай мове* | *У рускай мове* |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

(кішэня) ____________________ гадзіннік

(корань) ____________________ зуб.

✶ Абазнач суфіксы ў атрыманых словах.



**Алгарытм разбору слова па саставе.**

1. Змяняем слова, знаходзім зменную частку, выдзяляем канчатак: *паводк**а** – паводк**ай**, паводк**у***.

2. Падбіраем да слова аднакаранёвыя словы, знаходзім у іх агульную частку, выдзяляем у слове корань: *па**вод**ка, **вад**а, пад**вод**ны, **вадз**яны, раз**водд**зе.*

3. Калі перад коранем ёсць частка слова, то гэта прыстаўка.

4. Калі пасля кораня і перад канчаткам ёсць частка слова, то гэта суфікс.

Паводка

**7.** Прачытай. Знайдзі ў словах прыстаўку, корань, суфікс і канчатак. Запішы па ўзоры.

| Слова | Прыстаўка | Корань | Суфікс | Канчатак |
|---|---|---|---|---|
| узгоркі | уз- | -гор- | -к- | -і |
| прыморскі | | | | |
| грыбнік | | | | |
| ночанька | | | | |
| пералескі | | | | |

## *Правер сябе!*

### Тэст

**1.** Выберы правільныя выказванні.

Суфікс – гэта:

☐ зменная частка слова;
☐ частка слова, якая ўтварае новыя словы;
☐ частка слова, якая стаіць пасля кораня і служыць для ўтварэння новых слоў.

**2.** Адзнач словы, якія не маюць суфікса.

| | | |
|---|---|---|
| ☐ Ляснік; | ☐ абход; | ☐ бяроза; |
| ☐ дарога; | ☐ палявы; | ☐ сцяжынка. |

**3.** Адзнач словы, састаў якіх адпавядае схеме ⌒^.

| | | |
|---|---|---|
| ☐ Ночка; | ☐ домік; | ☐ мячык; |
| ☐ масток; | ☐ школьны; | ☐ сняжынка. |

**4.** Адзнач суфіксы, з дапамогай якіх можна ўтварыць новыя словы ад слова ***рыба***.

☐ -к; ☐ -ав; ☐ -ак; ☐ -н.

**5.** Адзнач радок, у якім усе словы маюць суфікс ***-ак***.

☐ Замок, мара́к, замаразак, горка.
☐ Знак, адзнака, рыбак, падарунак.
☐ Вятрак, ранак, ляжак, прыгорак.

# ЗМЕСТ

**Ад аўтараў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
**Паўтарэнне вывучанага ў 2-м класе** . . . . . . . . . . . . . . 4
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
**Тэкст**. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Прыметы тэксту. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
План тэксту . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
**Сказ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Прыметы сказа. Тыпы сказаў . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Апавядальны сказ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
Пытальны сказ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
Пабуджальны сказ. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Клічныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
**Галоўныя і даданыя члены сказа** . . . . . . . . . . . . . . 38
Дзейнік і выказнік – галоўныя члены сказа . . . . . . . 38
Даданыя члены сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
**Значэнне слова** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
Адназначныя і мнагазначныя словы . . . . . . . . . . . . 43
Прамое і пераноснае значэнне слоў . . . . . . . . . . . . . 46
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Сінонімы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Антонімы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Словы, аднолькавыя па гучанні, розныя па значэнні . . 53
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
**Склад слова** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Роднасныя (аднакаранёвыя) словы. Корань слова . . . . 57
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58

Корань. Чаргаванне гукаў у корані слова . . . . . . . . . . . .59
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .62
Формы слова. Канчатак. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .63
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .65
Прыстаўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .66
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .70
Суфікс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .72
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .76
**Часціны мовы** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .77
Назоўнік. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .77
Адзіночны і множны лік назоўнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . .80
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .83
Род назоўнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .84
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .88
**Прыметнік** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .89
Змяненне прыметнікаў па родах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .89
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .92
Змяненне прыметнікаў па ліках . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .93
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .96
**Дзеяслоў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .98
Дзеяслоў як часціна мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .98
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .101
Адзіночны і множны лік дзеясловаў. . . . . . . . . . . . . . . .102
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .105
Час дзеясловаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .106
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .110
Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах . . . . . . .111
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .114
Правапіс ***не*** з дзеясловамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .116
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .118
**Паўтарэнне**. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .120
Тэст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .124
**Спіс выкарыстаных крыніц** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .126